# § 23. Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны прырост. Міграцыя насельніцтва

***Узгадваем.*** *Чым характарызуюцца працэсы нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва? Што такое міграцыя насельніцтва?*

**Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны прырост.** У любой краіне пастаянна змяняецца колькасць насельніцтва. Асновай гэтага з'яўляецца *натуральны прырост*, які характарызуе натуральны рух насельніцтва ў краіне. *Што называецца натуральным прыростам?* У Беларусі на працягу многіх гадоў нараджальнасць перавышала смяротнасць. У 1960-х гг. натуральны прырост складаў 146,2 тыс. чалавек у год. Да канца 1980-х гг. ён панізіўся да 50,0 тыс. чалавек і працягваў зніжацца ў 1990-х гг., калі смяротнасць перавысіла нараджальнасць. У выніку ў Беларусі тып *узнаўлення насельніцтва* з пашыранага стаў звужаным. Натуральнае змяншэнне насельніцтва прывяло да **дэпапуляцыі**.

**Дэпапуляцыя** — працэс скарачэння колькасці насельніцтва ў краіне па прычыне звужанага ўзнаўлення, натуральнага або міграцыйнага змяншэння, адмоўнай дынамікі колькасці насельніцтва.

Натуральны прырост зніжаўся, як правіла, з-за змяншэння *нараджальнасці*. У 1989 г. агульны каэфіцыент нараджальнасці складаў 15,1 на 1000 чалавек, а да наступнага перапісу ён знізіўся да 9,3. Пачынаючы з 2005 г. нараджальнасць у краіне стала павялічвацца. Гэтаму спрыялі меры дэмаграфічнай бяспекі. *Якія меры дэмаграфічнай бяспекі былі зроблены для павелічэння нараджальнасці?* На працягу апошніх пяці гадоў агульны каэфіцыент нараджальнасці складаў больш за 12 на 1000 чалавек, што вышэй, чым у краінах Еўропы.

Другі працэс, які вызначае характар натуральнага руху насельніцтва, — *смяротнасць*. У сярэдзіне XX ст. у Беларусі яна зніжалася, расла сярэдняя працягласць жыцця. У другой палове XX ст. смяротнасць стала павялічвацца, а сярэдняя працягласць жыцця — зніжацца. Найбольш высокія тэмпы павелічэння смяротнасці назіраліся паміж перапісамі 1989 і 1999 гг. (з 10,2 да 14,2 на 1000 чал.). Пачынаючы з 2010 г. назіраецца зніжэнне агульнага каэфіцыента смяротнасці: з 14,4 да 12,6 на 1000 чалавек у 2017 г.

У Беларусі натуральны рух характарызуецца нязначным перавышэннем смяротнасці над нараджальнасцю. Найбольшай вастрыні дэмаграфічная сітуацыя дасягнула ў сельскай мясцовасці, якая апынулася ў стане дэпапуляцыі. Натуральныя страты сельскага насельніцтва ўпершыню

сталі назірацца на тэрыторыі Віцебскай вобласці, затым працэс паступова распаўсюдзіўся на ўсю рэспубліку.

За 1897–2017 гг. каэфіцыент нараджальнасці ў Беларусі знізіўся ў пяць разоў, смяротнасці — у два разы, натуральны прырост стаў адмоўным ці блізкім да нуля. Да якіх наступстваў гэта можа прывесці? Ці адносіцца Беларусь да старэючых краін? Свой адказ абгрунтуйце. Для якіх еўрапейскіх краін характэрная такая ж дэмаграфічная сітуацыя?

**Полаўзроставая структура насельніцтва.** Насельніцтва любой краіны адрозніваецца па ўзросце і поле, што звязана з асаблівасцямі ўзнаўлення і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па ступені працаздольнасці насельніцтва падзяляецца на тры групы: маладзейшыя за працаздольны ўзрост, працаздольнага ўзросту і старэйшыя за працаздольны ўзрост. Па сваёй узроставай структуры насельніцтва Беларусі падобна да шматлікіх краін Еўропы. Яно характарызуецца зніжэннем удзельнай вагі дзяцей і моладзі і павелічэннем долі людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. *Для якіх краін Еўропы характэрная найбольш высокая доля пажылых людзей?* Узроставая структура насельніцтва Беларусі адлюстравана ў табліцы 2.

*Табліца 2* — Узроставая структура насельніцтва Беларусі, %

| Насельніцтва | Гады | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1897 | 1939 | 1959 | 1979 | 1999 | 2009 | 2015 | 2018 |
| Маладзейшае за працаздольны ўзрост (0–14 гадоў) | 43,1 | 38,5 | 31,3 | 23,2 | 21,2 | 15,9 | 16,9 | 17,7 |
| Працаздольнага ўзросту (мужчыны 15–59 гадоў, жанчыны 15–54 гадоў) | 49,3 | 52,3 | 55,2 | 62,8 | 57,3 | 61,6 | 58,6 | 57,2 |
| Старэйшае за працаздольны ўзрост (мужчыны 60 і больш, жанчыны 55 і больш гадоў) | 7,6 | 9,2 | 13,5 | 14,0 | 21,5 | 22,5 | 24,5 | 25,1 |

З табліцы вынікае, што доля дзяцей і падлеткаў у краіне зніжаецца, а доля насельніцтва, старэйшага за працаздольны ўзрост, павялічваецца. Адбываецца інтэнсіўнае старэнне насельніцтва. У Беларусі доля насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, складае 25,1 %, г. зн. больш чым кожны чацвёрты. Такія змены ўзроставай структуры прывялі да правядзення пенсійнай рэформы і павелічэння пенсійнага ўзросту, як і ў большасці краін Еўропы.

На падставе ўказа Прэзідэнта «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння» праводзіцца пенсійная рэформа. Штогод з 01.01.2017 г. мінімальны ўзрост для афармлення працоўнай пенсіі павялічваецца на 6 месяцаў і да пачатку 2022 г. складзе 58 гадоў для жанчын і 63 гады — для мужчын. Як вы думаеце, чым выклікана неабходнасць правядзення ў Беларусі дадзенай рэформы?

У структуры насельніцтва па поле ў Беларусі пераважаюць жанчыны — каля 53 %. Гэта тлумачыцца неаднолькавай працягласцю жыцця мужчын і жанчын. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын складае 69 гадоў, а жанчын — 79 гадоў. *Як вы думаеце, чым тлумачыцца вялікая працягласць жыцця ў жанчын?* Хлопчыкаў у Беларусі нараджаецца больш прыкладна на 5 %, але з-за больш высокай дзіцячай смяротнасці сярод хлопчыкаў да 20–25-гадовага ўзросту колькасць мужчын і жанчын выраўноўваецца і застаецца такой да ўзросту 30–35 гадоў, пасля чаго пераважае жаночае насельніцтва. Ва ўзросце, старэйшым за 70 гадоў, назіраецца значная перавага колькасці жанчын. За мінулыя сем гадоў суадносіны мужчынскага і жаночага насельніцтва практычна не змяніліся (табл. 3). Сярэдні ўзрост мужчынскага насельніцтва ў Беларусі складае 37,5 года, а жаночага — 42,8 года.

*Табліца 3* — Колькасць мужчынскага і жаночага насельніцтва, тыс. чалавек

| Год | 2010 | 2012 | 2014 | 2016 | 2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| Мужчыны | 4418 | 4398 | 4401 | 4421 | 4422 |
| Жанчыны | 5082 | 5067 | 5067 | 5077 | 5070 |

Полаўзроставая структура насельніцтва найбольш поўна і наглядна паказвае змену тыпаў узнаўлення, адрозненні пакаленняў у дэмаграфічных паводзінах. Наглядным яе адлюстраваннем з'яўляецца полаўзроставая піраміда (мал. 95).




Мал. 95. Полаўзроставая піраміда насельніцтва (даныя на 1 студзеня 2018, чал.)

**Міграцыя насельніцтва.** На змяненне колькасці насельніцтва таксама ўплывае *міграцыя*, або яго механічны рух унутры краіны і за яе межамі. Міграцыйная актыўнасць у Беларусі павышалася на працягу XX ст. Унутраная міграцыя ў рэспубліцы пачалася ў выніку індустрыялізацыі ў 1920-х гг. і выяўлялася ў масавым перамяшчэнні людзей з сельскай мясцовасці ў гарады.

Насельніцтва стала канцэнтравацца ў буйных гарадах, для якіх характэрная таксама маятнікавая міграцыя. На мяжы 1980-х — 1990-х гг. у Беларусі адбыліся кардынальныя змены ў інтэнсіўнасці і скіраванасці міграцыйных патокаў. Асабліва істотна на іх паўплывалі распад СССР і наступствы катастрофы на ЧАЭС. У пачатку XXI ст. намеціліся новыя тэндэнцыі змены міграцыйных патокаў. Агульны аб'ём унутрырэспубліканскай міграцыі павялічваецца і складае 238,3 тыс. чалавек (мал. 96).

Знешняя міграцыя, якая ўключае эміграцыю і іміграцыю, таксама істотна адрознівалася на працягу XX ст. *Эміграцыя* насельніцтва ў першай палове стагоддзя была выклікана ў асноўным палітычнымі падзеямі (войны, рэвалюцыя і г. д.). У канцы XX ст. на першы план выйшлі эканамічныя і экалагічныя прычыны: распад СССР, эканамічны крызіс, вывад вайсковых частак у Расію, аварыя на ЧАЭС і г. д. Калі раней эміграцыя ахоплівала былыя рэспублікі СССР і часткова іншыя краіны (Ізраіль,




Мал. 96. Дынаміка ўнутрырэспубліканскай міграцыі насельніцтва Беларусі, чал.

Польшчу), то ў апошні час геаграфія краін пашырылася. Аб'ём міжнароднай міграцыі перавышае 35 тыс. чалавек. *З чым звязана павелічэнне колькасці краін, у якія эмігрыруе насельніцтва Беларусі?*

У адпаведнасці з ацэнкамі навукоўцаў у цяперашні час больш за 3,5 млн этнічных беларусаў пражывае за межамі нашай краіны. Найбольш буйныя беларускія дыяспары ўтварыліся ў Расіі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Польшчы і іншых краінах. Растлумачце асноўныя прычыны фарміравання беларускіх дыяспар у розных краінах. З якімі гістарычнымі падзеямі было звязана іх фарміраванне?

Працэсы *іміграцыі* таксама мелі розную інтэнсіўнасць на працягу XX ст. Яны спрыяюць агульнаму росту колькасці насельніцтва краіны. Падчас пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі ў рэспубліку прыбыло шмат спецыялістаў з рэспублік СССР. Вялікая колькасць імігрантаў з краін СНД і Балтыі прыйшлася на пачатак 1990-х гг. Галоўнымі прычынамі іміграцыі асоб беларускай і іншых нацыянальнасцей (так званая вымушаная іміграцыя) было жаданне вярнуцца на радзіму або да сваякоў, а таксама неабходнасць пакінуць зоны канфліктаў. Працоўная іміграцыя прадстаўлена асобамі, занятымі ў сферы паслуг, радзей — у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Розніца паміж прыбыўшымі ў краіну і выбыўшымі складае *сальда знешняй міграцыі*, якое можа быць або дадатным, або адмоўным.

У цяперашні час у краіне назіраецца дадатнае сальда міграцыі, пераважае ўнутраная міграцыя. Сальда знешняй міграцыі таксама дадатнае, за кошт чаго ў краіне назіраецца павелічэнне колькасці насельніцтва (мал. 97).




Мал. 97. Міжнародная міграцыя насельніцтва Беларусі, чал.

**Абагульнім і запомнім.** Беларусь адносіцца да краін са складанай дэмаграфічнай сітуацыяй. Для насельніцтва Беларусі характэрна перавышэнне долі насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, над дзіцячым насельніцтвам. У насельніцтве краіны пераважаюць жанчыны. У Беларусі назіраецца рост унутранай міграцыі і дадатнае сальда знешняй міграцыі.

1. Назавіце прычыны дэпапуляцыі насельніцтва ў Беларусі. 2. У чым заключаюцца асаблівасці ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі? 3. Якую інфармацыю можна атрымаць, аналізуючы полаўзроставую піраміду? 4. Якія віды міграцыі характэрныя для Беларусі?

5. Чаму ў Мінску самы нізкі паказчык смяротнасці? 6. Якімі фактарамі можна растлумачыць перавагу жанчын у агульнай колькасці насельніцтва краіны? 7. Якія змены адбыліся ў напрамках міграцыйных патокаў у пачатку XXI ст.? 8. Да якіх дэмаграфічных наступстваў можа прывесці міграцыя з сельскай мясцовасці ў горад?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы даныя малюнка 97, разлічыце сальда міграцыі.

## § 24. Працоўныя рэсурсы. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва

***Узгадваем.*** *Чаму самай важнай часткай насельніцтва з'яўляюцца працоўныя рэсурсы? Што такое этнас? Назавіце сусветныя рэлігіі.*

**Працоўныя рэсурсы.** Для эканамічнага развіцця краіны важнейшую ролю адыгрывае насельніцтва працаздольнага ўзросту, якое адносіцца